Т.І.БОРБАТ
(Мінск)

# СПОВЕДЗЬ ЗБАЛЕЛАГА СЭРЦА...
## (Роздум над сучаснай паэзіяй С.Грахоўскага)

У паэзіі апошняга дзесяцігоддзя, як і ва ўсёй беларускай літаратуры, адбываюцца працэсы, вызначаныя агульнай грамадскай атмасферай. З аднаго боку, з'явілася магчымасць гаварыць праўду, уздымаць тыя тэмы, якія раней былі забароненыя. З другога боку, крызісныя з'явы, бездухоўнасць, падзенне ўзроўню культуры і маралі — гэта таксама праўда нашай эпохі, якую "сумленная літаратура" не мае права замоўчваць [3,235]. Сучасная паэзія С.І.Грахоўскага прыцягвае ўвагу даследчыкаў і крытыкаў менавіта тым, што адпавядае патрабаванням часу: асэнсоўвае нашу эпоху, складаны ўнутраны свет сучасніка, падае маральна-філасофскі арыенцір светаўспрымання і паводзін, гуманістычную канцэпцыю "свету і чалавека".

У 1993 годзе выйшла новая кніга вершаў мастака "На апошняй вярсце". Зборнік адкрываецца лірычным вершам "Адзінота", гэта пачуццё не пакідае паэта да заканчэння кнігі: "Як пракляцця, баюся нямой адзіноты,// Безгалосся, бязгучча, застылай цішы..." [1,248]. Ужо аднойчы так было: пасля "зацішша" нечакана зноў грымнула "бура". Таму недзе ў падсвядомасці паэта застаецца насцярожанасць. Тэматычна блізкі да гэтага твора і верш "Спадзяванне":

*Я адзін, а за вокнамі мокрыя сосны*
*Адмаўляюць усё, не здаволены ўсім.*
*Ім і мне на змярканні аднолькава млосна,*
*Хоць ад скрухі і болю бабром галасі*

"Спадзяванне" (1, 270).

Такі душэўны стан лірычнага героя яшчэ больш абвастрае неабходнасць аб кім-небудзь клапаціцца, раздзяліўшы з ім адзіноту. І аўтар клапоціцца аб лёсе сваёй краіны, верыць у яе зорны час.

Жыццё "падкінула" С.Грахоўскаму яшчэ адно выпрабаванне: адзінота і памяць, напэўна, будуць непакоіць паэта да "скону жыцця", "да апошняй вярсты". Адзінае збавенне мастак бачыць у працы, у сваім служэнні народу. Слова для паэта — "адзіны родзіч", крыніца магічнай, гаючай сілы:

*І плачу, і бядую ўпотай,*
*І цешуся да забыцця*
*Туманным золкам вераснёвым*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*І пералётам журавоў.*
*У сэрцы зберажоным словам,*
*Даўно пазбаўлены правоў,*
*Адроджаным і незабытым,*
*Закрэсленым і зноў жывым.*
*Падстрэленым, ды не забітым,*
*Адзіным родзічам маім*
"Слова" (1, 272).

Надзея павінна жыць. Толькі яна дапаможа выжыць у "краіне дзіўных цудаў" сярод хлусні і здрады.

Добра адчуваючы праблемы часу, С.Грахоўскі не мог мінуць тэму стану нацыянальнай беларускай культуры. Мужна гучыць голас паэта ў абарону роднай мовы. Горкі папрок кідае мастак землякам, якія здрадзілі сваёй мове: "Хто ж знявечыў і памяць і слова,// Немаце забяспечыў размах." Нашу мову знішчалі, зняважалі як маглі, і зараз "ідзе яна на звод". А што будзе з намі, беларусамі?

*Так насельніцтвам зробімся толькі,*
*Калі з моваю знікне народ, —*
"Народ" (1, 233)

сцвярджае паэт.

Мова — душа народа, і калі яна загіне, чалавек стане бяздушным і чэрствым, загіне сам, бо "без роднае мовы —... бяздушныя душы".

Вострую праблему стану беларускай мовы паэт уздымае і ў вершах "Слова", "Мой народ". Мастаку жахліва ўявіць, што ён страціць апошняе, "адзінае", "сапраўднае багацце" ў сваім жыцці. Таму паэт упэўнены: "Час непрыкметна прабяжыць...// Мы знікнем, але будуць людзі// І Беларусь па-людску жыць" ("Пасерабрыла сівізна") і "мова заўсёды// Будзе жыць,// Будзе жыць" ("Слова"). Відаць, толькі ў такой упэўненасці ў сіле свайго "цярплівага і трывушчага" народа аўтар бачыць магчымае выйсце з такога становішча.

Аналізуючы творчасць А.Разанава, У.Конан справядліва заўважыў, што "страшнейшая за тэрмаядзерны Чарнобыль — катастрофа духоўная; яна папярэднічала яму, стала завяршэннем, вынікам духоўнага сну і здрады матчынаму краю, бацькоўскім традыцыям..." [4,247]. Як бы пацвярджаючы гэтыя словы, С.Грахоўскі адзначае, што занядбанне матчынай мовы звязана з іншымі негатыўнымі з'явамі ў грамадстве: моладзь адлучаецца ад зямлі ("Зямля", "Каго ты цураешся"), чарсцвеюць душы людзей ("Адказ", "Боль", "Глухі", "Вясёлая мама"), чалавек сваімі неабдуманымі ўчынкамі губіць зямную прыгажосць ("Салаўіны плач", "Чарнобыльскі чад"). І ў гэтым, на думку паэта, вінаватыя мы самі, наша



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

грамадзянская пасіўнасць і абыякавасць далі магчымасць несумленным людзям дарвацца да кіруючых пасад (“Сам”, “Маўчальнікі”, “Дабрадзей”, “Чынадралы”).

С.Грахоўскі добра паказвае ўсе складанасці і супярэчнасці нашага “ліхога стагоддзя”. І невядома, калі і хто адкажа на пытанне: “А куды ісці далей? Дзе выйсце?” Каго вінаваціць у тым, што праз паўстагоддзе яшчэ не аддадзены зямлі воіны — вызваліцелі свету ад фашызму? Ахвяры вайны папоўнілі нікому непатрэбныя смерці “ворагаў народа” (“Ахвяры”). Парасткі таталітарнай сістэмы вельмі глыбока ўкараніліся ў наша жыццё. Яны ўвасобленыя ў так званых заганах грамадства: хлусні, страце сумлення, падазронасці, хабарніцтве, кар’ерызме, бюракратызме, нядбайным кіраўніцтве (“Сумленне”, “Хлусня”, “Камуналка”, “Балючае”, “Чароўныя дамы”). І невядома, дакуль будуць кіраваць несправядлівасць, прадажніцтва, здрада.

Застаецца толькі спадзявацца, што на свеце шчырых і сумленных людзей больш, а гэтыя “пачвары чалавечага існавання” нявечныя.

Пісьменнік не можа зразумець “Як церпіць бедная зямля// Людскія і свае пакуты?” Гэта пытанне неаднойчы зрывалася з вуснаў сумленных людзей. І як тут не звернешся да Бога, калі невядома, што далей рабіць і на каго спадзявацца. Вера ў народзе заўсёды жыла, хоць яе “маральныя калекі” ўсяляк імкнуліся вынішчыць:

*... Патухлі свечкі і лампады,*
*Калі ў будзёнаўках чыны*
*Без жалю, веры і спагады*
*Дадолу кінулі званы.*

*Зрабілі ў алтары засекі,*
*Садралі срэбраны абклад,*
*І ачмурэлыя калекі*
*Ператварылі храм у склад*
“Вячэрні звон” (1, 252).

А што можа нарабіць чалавек, калі ў яго сэрцы няма Бога — нам паказала Гісторыя.

Нарэшце, Бог вяртаецца да людзей. Застаецца толькі маліцца, каб наш шматпакутны народ “зажыў жыццём дастойным чалавека” (“Малітва”).

Такім чынам, С.Грахоўскі найбольш арганічна, а значыць найбольш поўна змог перадаць супярэчнасці нашага “ліхога стагоддзя”. Паэт убачыў не толькі знешні развал жыцця, але і яго прычыны.

У час 70-годдзя сваёй творчай дзейнасці мастак выдаў чарговы зборнік вершаў — “Недапісаная кніга” (1996). Неабходна заўважыць, “што



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

С.Грахоўскі, застаючыся традыцыяналістам, далёкі ў паэзіі ад прыземленасці. Яго паэтычнае ўспрыняцце, здавалася б, абмежавана рэаліямі; змяшчае ў сабе акрамя ўсяго іншага і тое, што робіць паэзію паэзіяй пры любых абставінах — талент і пастаянную маладосць душы" (6, с.312).

Першы раздзел кнігі вершаў называецца "Лірычная памяць". У ім паэт нібы падводзіць вынік усяму свайму жыццю: "Імкліва бягуць за гадамі гады,// Як позні́я горкія слёзы; падводзіць "маральную мяжу", да якой падышло наша грамадства: "Пусцеюць душы і пусцеюць паркі".

А.Марціновіч, аналізуючы кнігу, справядліва заўважае, што "лірычны герой С.Грахоўскага — безумоўна, сын... не свайго часу, а сваёй эпохі. І ў гэтым істотная розніца, бо эпоха, называй яе як хочаш — нават, лёсавызначальнай, перабудоўчай і г.д. — усё ж чалавека ў многім калечыць. Тое, у што калісьці верылася, што ўспрымалася як адзінаправільнае, раптам аказалася мройным, ідалапаклонніцкім. А калі не раптам, а на схіле жыцця?" (6,313). Гэта ўжо трагедыя.

Лірычная памяць паэта ўбірае ў сябе юнацкія гады ("Майму інстытуту", "Равесніца", "Далёкае", "Незваротнае", "Ваганні"); успаміны аб сустрэчах з каханай ("Сцюдзёная ноч", "Белы бэз", "На Пцічы", "Чаромхавы чад", "Хвіліна развітання", "Твае далоні пахнуць першым снегам", "Уверцюра дваццатага стагоддзя").

Увогуле, для кнігі характэрна ўвага да "экалогіі пачуццяў, экалогіі кахання" чалавека.

Вершы на тэму кахання разнастайныя і па форме, і па змесце, па інтанацыі і філасофскім падыходзе. Адлюстроўваючы шматлікія адценні пачуцця, аўтар шукае адметныя сітуацыі, псіхалагічныя ўзроўні.

Каханне, на думку паэта, дапамагала і дапамагае людзям "адолець, абмінуць і абысці" ўсе няшчасці і цяжкасці. Гэта шчасце, якое трэба выпакутаваць. Душа героя перажыла і пакуты, і здраду, але гэта толькі прадгісторыя сапраўднага кахання ("Белы бэз", "Чаромхавы чад", "Шлюб", "Завялыя рамонкі"):

*І за сібірскай колкай агароджай*
*Здавалася ты самай дарагой,*
*Бо верылася ў будучае шчасце,*
*А шчасце — не растаца ў жыцці*
"Хвіліна развітання" (2, 29).

Верш пранікнёна-лірычны, у ім чалавечы боль і радасць максімальна набліжаны паміж сабой, непарыўна пераплецены і злучаны ў сэрцы героя, якое дае прытулак для ўласных і людскіх сумненняў і нягод.

За штодзённасцю ўзаемаадносін мы часам забываем, што каханне ў сваёй зямной аснове — цуд, яго цяжка зразумець, растлумачыць. Гэта



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тайна, дар божы. У глыбока лірычных творах мастак не саромеецца шчырасці пачуцця:

*Я трацїў і развагу, і спакой,*
*Пачуўшы голас ціхі і спакусны,*
*Лавіў руку гарачаю рукой*
*І вуснамі — асмужаныя вусны*
"Салаўіная ноч" (2, 30).

У шматлікіх вершах пра каханне гучаць восеньскія мелодыі незваротнасці і няўмольнасці часу, усеразбуральнага і абыякавага ў сваёй адвечнай хадзе. Каханне заўсёды сведчыць пра маладосць і жыццёвую сілу чалавека, і таму найбольш пакутуе ад імклівасці і няспыннасці жыццёвай плыні. Мелодыя адыходзячага часу напоўнена лёгкім смуткам і роспаччу па незваротным:

*Пастой... Паслухаем і пазайздросцім,*
*Пакуль праменьчык радасці не згас*
*Бяздумнай і вясёлай маладосці,*
*Якая больш не вернецца да нас*
"Твае далоні пахнуць першым снегам" (2, 21).

Востра адчуваецца адналінейная скіраванасць часу, імгненнасць жыцця чалавека, якое таму набывае асабістую каштоўнасць і сэнс, дорыць узаемную асалоду пачуццяў і перажыванняў.

Паэзія С.Грахоўскага — гэта паэзія гармоніі. Сум не супрацьстаіць гармоніі, ён з'яўляецца яе састаўной часткай. Без суму няма кахання, шчасця. Прытым сум не азмрочвае радасці жыцця, надае асаблівую вастрыню яго ўражанням, падкрэсліваючы думку аб канчатковасці чалавечага існавання, аб непаўторнасці кожнага яго імгнення ("Мелодыя", "Дагарае леташняе лісце", "Позняя восень"). Аднак, смутак у лірыцы С.Грахоўскага — гэта яшчэ і хваляванне за ўсё існае на зямлі. Таму і называе паэт смутак "светлым" ("Светлы смутак"), боль "салодкім" ("Салодкі боль"). Сум для паэта — гэта адчуванне далучанасці да клопатаў чалавека, яго мінулага, сучаснага і будучага, здольнасць самаахвяравання ў імя іншых. Нават шчасце, каханне будуць няпоўнымі без суму. Сумныя вочы каханай. Сумная памяць. Сумнае само жыццё: "Імкліва бягуць за гадамі гады,// Як познія горкія слёзы" (2, с.51).

Праз пакуты, спачуванне нараджаецца ўзаемаразуменне, давер, што складаюць для С.Грахоўскага ідэальную аснову чалавечых узаемаадносін. Самае жудаснае для лірычнага героя — згубіць гэтыя якасці:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Я спальваю сябе штодня*
*То клопатам, то хваляваннем*
*………………………………….*
*Душа збалелая баліць*
*Параненае сэрца ные,*
*Што мне грахі не замаліць*
*Ні ўласныя і ні чужыя*
"На вогнішчы сумлення" (2, 109).

Без суму немагчыма творчасць, ён робіць чалавека пранiклівым, дапамагае супрацьстаяць сытасці і самазаспакойванню. Лірычны герой С.Грахоўскага бязлітасна судзіць сябе, калі заўважае хоць малейшыя прыкметы самаздаволенасці: "Жыццё ўсяго адно, і часу мала,// Таму спяшайся і пішы, пішы " (2, 131).

У другім раздзеле кнігі "Балючыя элегіі" мастак працягвае даследаванне нашага напружанага жыцця.

Усе праблемы часу, усе катастрофы, страшэнныя несправядлівасці ўспрымаюцца паэтам як глыбока асабістыя ("Расплата", "Гулікі", "Апошняя", "Шукаю ўсмешку", "Каму мы трэба"). Суб'ектывізм іх успрымання падкрэсліваецца характэрнымі лірыка-публіцыстычнымі радкамі:

*Не ведаю, куды і як ісці.*
*За небасхілам дым і шквал крывавы,*
*А дзеці ўжо не мараць аб жыцці,*
*Аб гонары, аб подзвігах і славе…*
"Трывога трывог" (2, 195)).

Публіцыстычная завостранасць паэтычнага голасу С.Грахоўскага абумовіла распрацоўку новых жанравых форм, стылёвую поліфанію, паэтыку вершаў.

Грамадзянская пазіцыя лірычнага героя — пазіцыя патрыёта, чалавека з абвостраным пачуццём сумлення, адказнасці за ўсё, што адбываецца на зямлі, — прымушае мастака ўсё часцей і часцей звяртацца да жанру непасрэднага звароту да адрасата: маці, Радзімы, беларусаў. Звароты выконваюць у творах розную ідэйна-мастацкую функцыю. Напрыклад, у лірычным маналогу "Маці" паэт выказвае ўдзячнасць сваёй Радзіме — "маці беларускай" за працавітасць, вытрымку ў цяжкія хвіліны, маральную падтрымку сваім дзецям. Звяртаючыся да беларускага народа ("Мой народ"), паэт выказвае надзею на лепшы лёс

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларусі. Здзіўляе здольнасць мастака пранікаць у стагоддзі, звязваючы асабістае і дзяржаўнае, блізкае і далёкае: “А я — пясчынка гэтае зямлі,// Дзе пот і кроў ліюць, як і лілі” (2, с.186).

З горкай іроніяй паэт звяртаецца да “пакутнікаў за народ” (“Пакутнікі за народ”), што “не бачаць нашае бяды// За ўладу грызучыся ў цытадэлі” (2,247). Кожная страфа верша паглыбляе паказ драматычнага становішча беларусаў. І як крык душы паэта ўспрымаюцца радкі:

*О, дзікі свет! Скажы, каму паверыць?*
*З якімі прайдзісветамі ісці?*
*Якою меркаю іх душы мерыць,*
*Каго маліць, каго клясці?* (2, 248).

Душэўны боль лірычнага героя дапамагае перадаць і своеасаблівая паэтыка верша: шматлікія звароты, выгукі, простая мова, яркія метафары, вульгарызмы.

Усё часцей, звяртаючыся да самога сябе, паэт спрабуе знайсці адказы на хвалюючыя яго пытанні: “Калі ж нарэшце вернуцца парадкі// На нашай пакалечанай зямлі?” (“Пытанні”), “Ці гэта праўда, ці трызня, ці сон?// Знікаюць за надзеямі надзеі...” (“Трывога трывог”), “Але ж куды далей ісці?” (“Хвіліна адчаю”).

Клопатам мастака за будучае Радзімы і будучае нацыі вызначаюцца лірычныя маналогі: “Надзейны старт”, “Дарэмны крык”, “Гарадь лясы”, “У сацлагеры”, “Весела жывём”, “Безназоўныя элегіі” і інш. Голас паэта гучыць як голас усіх сумленных людзей краіны.

М.Лабанаў пісаў: “Сапраўдны пісьменнік — гэта заўсёды абвостранае непрыняцце несправядлівасці і самавольства, талент душэўнай спагады, здольнасць сэрцам адчуваць беды чалавека і сваёй краіны” (5,90). Менавіта такім мастаком слова ўяўляецца нам С.Грахоўскі.

**Літаратура:**


1. *Грахоўскі С.* Выбраныя творы. Вячэрні звон: Вершы, паэмы.— Мн.: Маст. літ. — 1994. — У 2 т. — Т.1.
2. *Грахоўскі С.* Недапісаная кніга: Вершы.— Мн.: Маст. літ., 1996.
3. *Дзюбайла П.* Час страчаных ілюзій .—Полымя, 1993.—№ 11.
4. *Конан У.* Узыходжанне. Творчасць А.Разанава .—Полымя, 1997.—№ 12.
5. *Лобанов М.* Время врывается в книги.— М.: Сов. писатель, 1963.
6. *Марціновіч А.* У слове — боль душы. —Полымя, 1997.—№ 6.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова